СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 9 (740) | Чацвер, 10 лютага | 1944 г.

У ноч з 6 на 7 лютага вялікая група нашых бамбардыроўшчыкаў зрабіла масіраваны налёт на горад Хельсінкі.

У выніку бамбардыроўкі ў горадзе ўзнікла звыш 30 пажараў, суправаджаўшыхся вялікімі ўзрывамі. Полымя пажараў нашы лётчыкі наблюдалі на адлегласці 250 км.

Паветранай разведкай днём 7 лютага ўстаноўлена, што ў Хельсінкі пажары не ліквідаваны, горад працягвае гарэць і знаходзіцца ў дыму.

## Дастойна сустрэнем 26-ю гадавіну Чырвонай Арміі

### ЗВАРОТ ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК АТРАДА ІМЯ Ф. ДА ЎСІХ ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Чырвоная Армія паспяхова гоніць нямецка-фашысцкія орды на захад, вызваляючы ўсё новую тэрыторыю ад ворага. Звыш 30 раёнаў нашай роднай Беларусі і абласныя цэнтры ГОМЕЛЬ і МОЗЫР вызвалены ад нямецкай няволі. Чырвоная Армія падышла да раёнаў нашай Мінскай абласці.

Мы, партызаны і партызанкі атрада імя Ф. люта і бязлітасна помсцім ненавісным акупантам за разбураныя гарады і спаленыя вёскі, за тысячы забітых і зверскі замучаных нашых совецкіх людзей. Мы ворагу не даём спакою ні днём, ні ноччу. На нашым баявым рахунку лічыцца: 6 знішчаных нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, 6 спушчаных пад адкос эшалонаў, 55 узарваных аўтамашын, 632 забітых і параненых гітлераўцы, 540 узарваных рэльс на варожых чыгунках, 53 кілометраў парванай сувязі, 3 спаленыя базы і склады, 46 узарваных мастоў. Але на гэтым мы не супакоімся. За кроў і слёзы нашых людзей мы будзем помсціць фашысцкім гадам з усёй ненавісцю нашых сэрцаў, да канчатковага выгнання нямецкіх захопнікаў з нашай зямлі.

Партызаны і партызанкі нашай зоны. Набліжаецца 26-я гадавіна нашай гераічнай Чырвонай Арміі. У чэсць гэтай гістарычнай даты мы заклікаем Вас з яшчэ большай актыўнасцю весці бязлітасную барацьбу ў тылу ворага- не дапускаць да лініі фронта эшалонаў і аўтамашын праціўніка, знішчаць сувязь і жывую сілу ворага, узрываць масты і склады, не даваць немцам паліць нашы вёскі і ўганяць нашых людзей у нямецкае рабства. Усімі сіламі дапамагаць фронту, нашым слаўным чырвоным воінам, якія нясуць на сваіх баявых сцягах вызваленне ад нямецкага прыгнёта і адраджэнне раднаснага і шчаслівага жыцця нашаму народу.

Няхай жывуць гераічныя чырвоныя воіны!

Няхай жыве геніяльны і мудры палкаводзец таварыш Сталін, які вядзе наш народ да канчатковай перамогі над ворагам!

Смерць і помста нямецкім акупантам!

(Прынята на агульным сходзе партызан і партызанак атрада імя Ф).

## Па Совецкаму Саюзу

2 лютага ў Крэмлі адбылося ўручэнне дэлегацыі грамадзян Сталінграда ганаровага меча—дара караля Велікабрытаніі Георга VI-га ў азнаменаванне гераічнай абароны гэтага горада. Ад імені Старшыні СНК СССР таварыша Сталіна меч быў уручан Маршалам Совецкага Саюза таварышам Будзённым главе дэлегацыі грамадзян Сталінграда старшыне выканкома Сталінградскага гарадскога совета т. Пігалеву.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 5-га ПА 9 ЛЮТАГА)

На Нарвскім напрамку нашы войскі поўнасцю ачысцілі ад праціўніка ўсходні бераг ракі Нарва.

Нашы войскі, наступаючы ўздоўж узбярэжжа Чудскога возера занялі некалькі насялёных пунктаў.

Паўднёвей Сіверскі, заходней Любань і паўночней Новасакольнікі нашы войскі занялі 100 насялёных пунктаў.

Войскі 1-га Украінскага фронта, у выніку імклівага ўдара і ўмела праведзенага абходнага манеўра, авалодалі абласнымі цэнтрамі Украіны ЛУЦК, РОЎНА, г. Здолбунова, занялі 10 райцэнтраў, 19 чыгуначных станцый і звыш 200 насялёных пунктаў.

Паўночней Звенігародка і Шпола нашы войскі працягвалі весці паспяховыя баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка і, сціскаючы кальцо акружэння, занялі 30 насялёных пунктаў і райцэнтр Кіеўскай абласці.

Войскі 3-га Украінскага фронта прарвалі сільна ўмацаваную абарону немцаў, прасунуліся ўперад ад 45 да 60 км. і расшырылі прарыў да 170 км. па фронту. Войскі фронта занялі гг. Апосталава, Нікопаль, 250 насялёных пунктаў і адрэзалі адход 5 нямецкім дывізіям на захад.

Войскі 4-га Украінскага фронта нанеслі страты 7 дывізіям праціўніка, ачысцілі ад яго плацдарм на левым беразе Днепра па фронту 120 км., занялі 2 райцэнтры Запарожскай абласці і звыш 40 насялёных пунктаў.

За 4 дні баёў знішчана 302 нямецкіх танкі і збіта 213 самалётаў праціўніка.

З БАЯВОГА ЖЫЦЦЯ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ

# Дружным залпам па аўтамашынах

Партызаны атрада, дзе камандзірам Барыс М., выконваючы загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна і поспехамі Чырвонай Арміі на франтах Айчыннай вайны, што дзённа ўзмацняюць удары па тылах ворага.

На днях група партызан каšага атрада пад кіраўніцтвам тав. А. вышла на баявое заданне. Ёй пастаўлена задача —зрабіць засаду на магістралі працўніка.

Народныя мсціўцы непрыкметна падышлі да гравейкі Слуцк-Мінск і размясціліся ў баявым парадку. Чакаць доўга не прыйшлося. Праз некалькі мінут паказалася калона аўтамашын з нямецкімі салдатамі і боепрыпасамі.

Па камандзе партызаны дружным залпам з кулямётаў, аўтаматаў і вінтовак адкрылі шквальны агонь па аўтамашынах ворага.

Партызаны падбілі 7 аўтамашын. Звыш 50 гітлераўцаў асталося валяцца каля падбітых машын.

Без страт народныя мсціўцы, задаволены сваім поспехам з песнямі і радасцю на сэрцы, звярнуліся ў лагер.

АНДРЫЯНАЎ.

# Узарвалі нямецкі эшалон

Гітлераўскія палачы, узмацніўшы ахову чыгункі Асіпавічы-Слуцк, рашылі адкрыць на ей рух. Па гэтай чыгунцы немцы вывозяць у сваю галодную Германію нарабаванае дабро ў сялян Слуцкага, Грэскага і другіх раёнаў.

Мы рашылі не дапусціць нямецкага эшалона з прадуктамі ў Германію і замініравалі чыгунку. На пастаўленай міне ішоўшы эшалон узарваўся, ў выніку чаго пашкоджан паравоз, а вагоны разбіты.

„Лепш знішчыць сваё дабро, як аддаваць немцам"—так заявілі народныя мсціўцы атрада імя Ф., адходзячы ад чыгункі.

КОСЦЯ К.

# Дзве групы

Знішчальная група пад кіраўніцтвам Васіля Б. зрабіла засаду на шасе, па якому павінны былі рухацца немцы.

Калі паказаліся нямецкія аўтамашыны, па іх быў адкрыт дружны агонь. Гітлераўцы, як зайцы, кідаліся ў розныя бакі, але ўсюды яны трапілі пад партызанскія кулі. „Вось вам за маю спаленую вёску, за забойствы" — гаварыў Сямён Е., які вёў меткі агонь з свайго кулямёта.

Адыходзячы ад шасе, народныя мсціўцы пакінулі на дарозе дзве спаленыя варожыя аўтамашыны, 5 забітых і 4 параненых фрыцы.

Другая група пад кіраўніцтвам Івана С-б падбіла дзве аўтамашыны з гітлераўцамі. У гэтай аперацыі ініцыятыву праявіў кулямётчык Іван С-еў.

АНАТОЛІ А.,
пам. камісара атрада імя Б.

# З засады па немцах

Партызаны падраздзялення, дзе камандзірам тав. Канстанцін А. на гравейнай дарозе С.-М. зрабілі засаду і абстралялі ішоўшыя аўтамашыны працўніка.

Ружэйна-кулямётным агнём народныя мсціўцы падбілі 4 варожыя машыны і забілі 8 нямецкіх салдат.

„Свае песні мы памножым"—так заявіў к-р т. А.

ЦІМОХ К.,
атрад імя С.

# Новыя злачынствы здраднікаў радзімы

Па загаду прэскай бандыцкай шайкі на чале здраднікаў Радзімы Душэўскага, Купы і Шараева паганыя сабакі-паліцэйскія ўтвараюць новыя злачынствы на тэрыторыі раёна. 4 студзеня яны зрабілі ўзброены паход супроць мірных жыхараў.

Пад прыкрыццем броневікоў паліцэйскія, як ваўкі, уварваліся ў населеныя пункты Вярбішчына і Перэвалака, але ажыццявіць свой бандыцкі намер ім не ўдалося. Усё насельніцтва са сваёй жывёлай скрылася ў лес. Уварваўшыся ў Вярбішчына і Перэвалаку і не заставўшы нікога з жыхараў, паліцэйскія факельшчыкі пачалі падпальваць будынкі.

К гэтаму маменту падаспелі партызаны атрада, дзе камандзірам Васіль З. і адкрылі агонь па бандытах. Баючыся народнай помсты, паліцэйскія, пакінуўшы населеныя пункты, адышлі. Насельніцтву разам з партызанамі ўдалося затушыць пажар, згарэлі толькі 3 хаты.

Няхай запамятаюць здраднікі Радзімы, што ім не ўйсці ад народнай помсты за іх злачынствы, учыненыя на нашай зямлі. Чырвоная Армія скора прыйдзе і ў наш раён—ніхто не выратуе гітлераўскіх факельшчыкаў і забойцаў ад адказнасці і хуткай гібелі. А таксама будуць знешчаны з твару савецкай зямлі і ўсе тыя, хто прадаўся немцам і выступіў супроць свайго народа.

Т. БЕРАЗОЎСКІ.

# За граніцай

У Італіі часці амерыканскай 5-ай арміі вядуць жорсткія баі на акраінах горада Касіна.

* * *

Па прагну студзеня самалёты англійскай бамбардыровачнай авіяцыі скінулі на Германію 16.000 тон бомб, з іх 9.300 тон бомб скінута на Берлін.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б

Друкарня газеты „Сталінец".

Нацыянальная бібліятэка Беларусі